# Выстаўка, прысвечаная 500-годдзю друкавання кніг у Расіі

Учора ў Дзяржаўнай бібліятэцы ім. Леніна (Мінск) адкрылася выстаўка, прысвечаная 500-годдзю друкавання кніг у Расіі. Выстаўка мае 6 асноўных раздзелаў.

Уводная частка выстаўкі знаёміць гледача з рукапіснымі выданнямі, якія былі папярэднікамі друкавання кніг. Самым старэйшым з іх з'яўляецца кніга «Тураўскае евангелле», напісаная ў XI стагоддзі.

Першым беларускім кнігадрукаром быў Францыск Скарына, які ў 1517—1519 і 1525 гг. выдаў першыя кнігі, перакладзеныя на старабеларускую мову пад назвамі «Біблія» (у яе ўваходзяць 23 кнігі), «Апостал» і «Кніга падарожная».

Першыя друкарні ў Беларусі з'явіліся ў XVI стагоддзі. У 1559 г. была створана друкарня ў Брэсце, затым яны паяўляюцца ў Несвіжы Заблуддзі (недалёка ад Беластока). У XVII і першай палавіне XVIII стагоддзя друкарні ствараюцца ў Магілеве, Слуцку, Слоніме, Пінску, Полацку і Мінску.

У раздзеле «Рэдкія кнігі» асаблівую цікавасць прадстаўляе кніга Герберштэйна Сігізмунда (1486—1566 гг.). Праз яе заходняя Еўропа ўпершыню атрымала больш-менш гістарычна праўдзівы матэрыял аб рускай дзяржаве і Беларусі. З замежных рэдкасных кніг тут можна ўбачыць першыя выданні Дэкарта, Ісаака Ньютона, Макіявелі, рад кніг, апісваючых Расію, Беларусь і Польшчу ў XVI, XVII і XVIII стагоддзях.

Асобны раздзел «Рэвалюцыйная літаратура» мае матэрыялы, якія ахапляюць Французскую буржуазную рэвалюцыю і Парыжскую Комуну. Ёсць літаратура, прысвечаная паўстанню дзекабрыстаў.

Асаблівую цікавасць прадстаўляе газета «Искра», асобныя нумары якой (38 і 41) прадстаўлены на выстаўцы. Вялікую частку раздзела займаюць дарэвалюцыйныя выданні твораў Маркса, Энгельса, Леніна.

Заканчваецца выстаўка раздзелам «Кнігі совецкага перыяда». Тут шырока паказаны кнігі і журналы, надрукаваныя на розных мовах народаў СССР.

У вітрынах выстаўкі змешчана каля 300 рэдкасных кніг, а ўсяго такіх кніг у бібліятэцы падабрана каля 1.000 экземпляраў. Вітрыны выстаўкі паступова будуць абнаўляцца.

**Н. АЛЬФЕР.**